ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА РЭКТАРАТА МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

№ 37 (728) ● Аўторак, 24 снежня 1968 г. ● Год выдання XXII ● Цана 2 кап.

## ІНФАРМАЦЫЙНАЕ ПАВЕДАМЛЕННЕ

19 снежня адбыўся агульнауніверсітэцкі справаздачна-выбарны партыйны сход. З дакладам выступіла сакратар парткома дацэнт Т. Я. Дударава. У абмеркаванні даклада прынялі ўдзел дэкан журфака Р. В. Булацкі, дэкан факультэта па рабоце з замежнымі студэнтамі К. К. Герман, выкладчык фізічнага факультэта П. Л. Салаў, дэкан біялагічнага факультэта П. Р. Пятровіч, намеснік сакратара партбюро гістфака У. Н. Сідарцоў, партгрупорг трэцяга курса юрфака М. І. Саўчанка, сакратар камітэта камсамола універсітэта М. Д. Ціва, выкладчык В. М. Мічкоў, прарэктар па навуковай рабоце прафесар Л. В. Валадзько, рэктар, акадэмік АН БССР А. Н. Сеўчанка, сакратар Ленінскага райкома партыі Р. С. Піонава, міністр вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі БССР М. М. Мяшкоў.

Актыўны ўдзел у рабоце справаздачнага сходу камуністаў універсітэта прынялі сакратар Мінскага абкома КПБ А. Ц. Караткевіч, міністр вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі БССР М. М. Мяшкоў, сакратар Мінскага гаркома партыі Т. Ц. Дзмітрыева, сакратар Ленінскага райкома партыі Р. С. Піонава.

Сход прызнаў работу парткома за справаздачны перыяд здавальняючай і прыняў разгорнутае рашэнне, накіраванае на ўзмацненне ролі партыйнай арганізацыі ва ўсіх галінах жыцця універсітэцкага калектыву, на дасягненне далейшых поспехаў у выкананні планаў камуністычнага будаўніцтва.

Выбран новы састаў партыйнага камітэта. У яго ўвайшлі Л. С. Абецэдарскі, У. С. Багданаў, К. Я. Вінакураў, Ф. Д. Гахаў, М. К. Гарбачоў, М. Е. Дастанка, Т. Я. Дударава, І. П. Зяцькоў, М. І. Іоська, С. У. Калішэвіч, С. А. Лысенка, І. А. Мазжухін, У. Ф. Нікіцін, Т. І. Прытыцкая, Г. Я. Рылюк, А. Н. Сеўчанка, М. Д. Ціва, І. Р. Цішчанка, М. Я. Шкляр.

Сакратаром парткома зноў выбрана дацэнт, кандыдат гістарычных навук Таццяна Яфімаўна Дударава.

КПБ 50

## КАНФЕРЭНЦЫЯ ЧЫТАЧОЎ

*У чытальнай зале бібліятэкі адбылася канферэнцыя чытачоў, прысвечаная 50-годдзю беларускай савецкай літаратуры. Гэта была цікавая і, што ў даным выпадку не менш важна, шчырая размова — бо думкі радавога аматара мастацкага слова не менш цікавыя і павучальныя, чым ацэнка прафесіянальнага літаратара.*

*Выступленні Г. Ганчаровай, А. Браценнікавай, Г. Сервута, М. Хадзько, О. Лапцевай, прысвечаныя творчасці М. Лобана, І. Мележа, Я. Брыля, І. Пташнікава, В. Быкава, вылучаліся вось гэтым самым асабістым пунктам гледжання чытача.*

*Вельмі ўдала выкарыстаў форму паэтычнага мантажа Н. Паўлавец, які зрабіў паведамленне на тэму «Сучасная беларуская паэзія». Аб эстэтычнай каштоўнасці мастацкай літаратуры гаварыў у сваім заключным слове кіраўнік канферэнцыі прафесар М. Р. Ларчанка.*

*В. ДУДКО.*

## Рукі прэч ад В'етнама!

*ІНТЭРНАЦЫЯНАЛЬНЫ ВЕЧАР МОЛАДЗІ*

Працоўныя г. Мінска, як і ўсе савецкія людзі, разам з в'етнамскім народам адзначаюць 8-ю гадавіну ўтварэння Нацыянальнага фронту вызвалення Паўднёвага В'етнама.

Актавую залу Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна вечарам 20 снежня запоўнілі прадстаўнікі навучэнцкай і рабочай моладзі сталіцы рэспублікі. Прысутнічае вялікая група юнакоў і дзяўчат В'етнама, дзяржаў Азіі, Лацінскай Амерыкі і Афрыкі, якія навучаюцца ў Мінску.

Першым на трыбуну падымаецца віцэ-прэзідэнт зямляцтва в'етнамскіх студэнтаў Нгуен Ван Тхоа. Ён расказаў аб барацьбе в'етнамскага народа супраць амерыканскіх агрэсараў і іх сайгонскіх марыянетак, выказаў глыбокую падзяку сацыялістычным краінам, усім прагрэсіўным сілам зямлі, якія выступаюць за мір, і асабліва народам Савецкага Саюза.

Выступіўшыя затым студэнтка юрыдычнага факультэта БДУ Галіна Уласенка, прадстаўнік навучэнцкай моладзі Кубы Борыс ла Серна, ліванскі студэнт Жак Антуан Амідзі, самалійскі студэнт Ахмед Амар Асман, намеснік сакратара камітэта камсамола Мінскага камвольнага камбіната Валерый Скварцоў, прадстаўнік Міністэрства вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі БССР Г. І. Гракаў сардэчна павіншавалі народ Паўднёвага В'етнама са слаўнай гадавінай утварэння Нацыянальнага фронту вызвалення, пажадалі яму новых перамог над ворагам.



## ПЕРАМОЖЦЫ ВЫЗНАЧАНЫ

Рыхтуючыся дастойна сустрэць слаўны юбілей рэспублікі, калектывы супрацоўнікаў вучэбных карпусоў бралі на сябе абавязацельствы па ўтрыманню ва ўзорным становішчы ўсіх універсітэцкіх памяшканняў. Днямі падведзены вынікі юбілейнага спаборніцтва. Лепшых паказчыкаў дабіўся калектыў гуманітарнага корпуса, якому і прысуджана першае месца. За ім ідуць калектывы вучэбных карпусоў па вуліцы Маскоўскай, хімічнага, радыёфізікі і галоўнага, біялагічнага.

У гэтыя ж дні праведзена праверка ўсіх студэнцкіх інтэрнатаў. У выніку камісія прыйшла да аднадушнага рашэння прысудзіць першае месца студэнцкаму інтэрнату па вуліцы Свярдлова. Нягледзячы на тое, што будынак гэтага інтэрната больш стары, чым іншыя, у ім створаны ўсе ўмовы для таго, каб студэнты пасля лекцый маглі добра адпачыць, падрыхтавацца да заняткаў, зрабіць неабходныя бытавыя справы. Студэнцкі калектыў на чале са студсаветам (старшыня Н. Ліпаўка) і пры дапамозе і актыўным удзеле каменданта Н. С. Галінай нямала зрабіў для таго, каб вывесці свой інтэрнат у лік лепшых. Тут чыста і ўтульна, добра аформлены ленінскі пакой і чытальныя залы, дакладна вядзецца дзяжурства. Прыемнае ўражанне застаецца і ад большасці студэнцкіх пакояў.

Добрым парадкам і чысцінёй вызначаюцца таксама інтэрнаты №№ 2 і 3. Ім прысуджана другое месца. На трэцім — інтэрнат № 5 (каменданты тт. Кавецкая, Еўдаш, старшыня студсавета В. Нясцюк), чацвёртае і пятае занялі адпаведна інтэрнаты № 6 і № 4.



НА ЗДЫМКУ: заўсёды цішыня і спакой у чытальнай зале інтэрната па вуліцы Свярдлова.

Фота М. НІЧЫПАРЭНКІ.

## НЕСЦІ Ў МАСЫ ЛЕНІНСКІЯ ІДЭІ

Уся наша краіна рыхтуецца шырока і ўрачыста адзначыць 100-годдзе з дня нараджэння У. І. Леніна. У гэтых умовах арганізацыя таварыства «Веды» БДУ лічыць сваёй асноўнай задачай шырокую прапаганду ленінскіх ідэй сярод працоўных, несці ў масы ідэйныя скарбніцы ленінскай партыі, багацця навукі і жыццёвага вопыту нашага народа.

Станоўчы вопыт лекцыйнай прапаганды, які быў накоплен у сувязі з падрыхтоўкай і правядзеннем 50-годдзя Вялікага Кастрычніка і падрыхтоўкай да святкавання 50-годдзя БССР і КПБ, наша арганізацыя стараецца не толькі замацаваць і выкарыстаць, але і ўзбагачае яго новымі творчымі элементамі.

Нягледзячы на шматлікія формы прапаганды, на ўсё ўзрастаючы паток радыё-тэлевізійнай і газетнай інфармацыі, вусная лекцыя захоўвае сваю вядучую ролю. Таму мы ва ўсіх сваіх планах асаблівую ўвагу надаем жывому вуснаму слову, непасрэднай сувязі са слухачамі.

Шырока практыкуюцца ў нас калектыўныя выезды кафедр на прадпрыемствы, цыклы лекцый, тэматычныя гутаркі, навукова-тэарэтычныя канферэнцыі, вечары пытанняў і адказаў, сустрэчы са старымі бальшавікамі, якія стаялі каля калыскі Савецкай дзяржавы, універсітэты ленінскіх ведаў і г. д.

Аднак яшчэ не ўсе навуковыя супрацоўнікі, выкладчыкі і аспіранты БДУ ўдзельнічаюць у распаўсюджанні ведаў у народзе, не выконваюць запаветы вялікіх рускіх і савецкіх вучоных, якія разглядалі гэтую высакародную місію «другой сваёй службай Радзіме».

У. І. Ленін лічыў распаўсюджванне палітычных і навуковых ведаў у масах першасным грамадзянскім абавязкам вучоных, усёй савецкай інтэлігенцыі. Несці навуку ў народ карысна і для самой навукі. Іншы раз творчая справаздача ў масавай аўдыторыі у сэнсе асвядамлення праблем у буйнамаштабным плане сваёй работы дае больш, чым даклад на навуковай канферэнцыі спецыялістаў. Не грэх нашым вядомым вучоным выступаць з творчымі справаздачамі перад шырокай аўдыторыяй, гэтак жа як і карысна для саміх маладых вучоных набываць лектарскія навыкі.

У свеце звароту універсітэцкай арганізацыі таварыства «Веды», які быў апублікаваны ў папярэднім нумары газеты, а таксама ў сувязі з рашэннямі праўлення таварыства «Веды» БССР аб правядзенні рэспубліканскага конкурсу на лепшы тэкст лекцыі па грамадска-палітычнай тэматыцы і аб правядзенні грамадскага агляду работы арганізацыі таварыства «Веды», неабходна дакладна вызначыць задачы пярвічных арганізацый факультэтаў, кафедр. Яны павінны дабіцца таго, каб кожны прафесар, дацэнт, выкладчык, аспірант два-тры разы ў семестр выступаў з лекцыямі або дакладамі ў інтэрнатах студэнтаў БДУ, на прадпрыемствах, у школах, ва ўстановах Мінска і іншых гарадоў, у саўгасах і калгасах па пуцёўках таварыства і партыйных арганізацый. Мы павінны ўсё больш прыцягваць да навукова-папулярызатарскай работы падрыхтаваных студэнтаў старшых курсаў.

Расшырэнне калектыву лектараў, падрыхтоўка лектараў з ліку моладзі (аспірантаў і студэнтаў) — пытанне хвалюючае.

Думаецца, тое, што зрабіў прафесар М. Я. Шкляр, з'яўляецца адной з карысных форм падрыхтоўкі маладых лектараў. На базе спецсемінара на гістфаку ён стварыў групу лектараў з 36 чалавек, якія паспяхова выступаюць у школах і на прадпрыемствах Мінска з тэматыкай, прысвечанай 50-годдзю БССР і КПБ.

Карысна было б увесці ў практыку заахвочванне лепшых супрацоўнікаў дэканатаў, кафедр, пярвічных арганізацый таварыства «Веды» за добрую падрыхтоўку маладых лектараў.

Няма неабходнасці даказваць, што развіццё ў студэнта мастацтва папулярызацыі атрыманых ім ведаў — важная састаўная частка вучэбна-выхаваўчага працэсу.

Выкананне абавязацельстваў, узятых арганізацыяй таварыства «Веды» па прапагандзе ленінскіх ідэй у сувязі з падрыхтоўкай да 100-годдзя з дня нараджэння У. І. Леніна, — справа гонару і абавязку кожнага з нас, ад прафесара да студэнта.

Дазвольце пажадаць прапагандыстам поспехаў у гэтай пачэснай справе.

**М. РЭЗНІКАЎ,**
старшыня праўлення раённага аддзела таварыства «Веды» БДУ, дацэнт.

⊙



Брыгада лектараў універсітэта перад выездам у адзін з раёнаў Беларусі.

# ВАЖНЕЙШЫ АБАВЯЗАК КАМУНІСТАЎ

Гомелі. Прамоўца вітае гэтае рашэнне і лічыць, што яно да многага абавязвае наш калектыў. Справа ідзе не толькі аб тым, што мы павінны дапамагчы новай вышэйшай установе кадрамі, можа нават падзяліцца абсталяваннем для лабараторый. На думку П. Р. Пятровіча, стварэнне універсітэта на Палессі (дарэчы, добра было б і назваць яго Палескім) востра ставіць пытанне аб пераглядзе структуры і нашага універсітэта. Універсітэты не павінны дубліраваць адзін другога. Больш таго, паяўляецца магчымасць адмовіцца ад падрыхтоўкі, скажам, біёлагаў шырокага профілю. Нам неабходны цяпер спецыялісты па рыбнай гаспадарцы, іншых галінах. Спецыялізацыю можна правесці і па другіх дысцыплінах.

Сваё цікавае выступленне дэкан закончыў, карыстаючыся прысутнасцю міністра, адказных супрацоўнікаў абкома, гаркома і райкома партыі, пажаданнем адзначыць слаўны юбілей рэспублікі ўзвядзеннем манументальных збудаванняў у гонар гэтай важнай падзеі. Камуністы сустрэлі прапанову гарачымі апладысментамі.

Намеснік сакратара партбюро гістфака **У. Н. Сідарцоў** і партгрупорг трэцяга курса юрфака **М. І. Саўчанка** ў сваіх выступленнях падкрэслілі неабходнасць павышэння ролі партыйных студэнцкіх груп, арганізацыі абмену вопытам паміж імі. Акрамя таго, У. Н. Сідарцоў расказаў камуністам аб поспехах метадычных камісій гістфака. Яны значныя — тут ужо даўно вядзецца інтэнсіўная работа па ўдасканаленню вучэбных праграм, падрыхтоўцы і выданні падручнікаў, дапаможнікаў. Партыйны камітэт даўно звярнуў увагу на гэты вопыт, прапагандуе яго. Прыемна, што і ў падрыхтоўцы да рэвалюцыйных юбілеяў гісторыкі падказваюць многа новага і цікавага іншым факультэтам.

Сакратар камітэта камсамола **М. Д. Ціва** і выкладчык **В. М. Мічкоў** прысвяцілі свае выступленні выхаваўчай рабоце сярод моладзі. Камсамольцы універсітэта, рыхтуючыся да 50-годдзя БССР і Кампартыі Беларусі, 100-годдзя з дня нараджэння У. І. Леніна, запісалі на свой рахунак нямала добрых спраў. Вызначыліся нашы студэнты на будоўлях, у арганізацыі паходаў па месцах рэвалюцыйных, баявых і працоўных подзвігаў, шмат падзяк атрымалі ад насельніцтва студэнцкія агітбрыгады, калектывы самадзейнасці. Аднак камуністы чакаюць ад камсамольцаў яшчэ большага. У першую чаргу размова ідзе аб неабходнасці падняць на належны ўзровень работу факультэцкіх арганізацый ДТСААФ, абаронных гурткоў. Патрыятычнае выхаванне моладзі павінна быць у цэнтры ўвагі камсамольскай арганізацыі універсітэта.

Беларусь аказвае вялікую дапамогу В'етнамскай Дэмакратычнай Рэспубліцы, іншым краінам сацыялізма і народам, якія нядаўна вызваліліся ад каланіяльнага прыгнёту, у падрыхтоўцы высокакваліфікаваных кадраў. Аб гэтым падрабязна гаварыў у сваім выступленні дэкан па рабоце сярод замежных студэнтаў **К. К. Герман.** Ён расказаў аб тым, як партыйны камітэт дасканала займаўся гэтай справай, назваў многа імён выкладчыкаў, якія, не шкадуючы свайго часу, многа робяць для выхавання замежных студэнтаў. Прафесары тт. Ельяшэвіч, Гахаў, Вафіядзі, Валадзько, Ракіцкі, Левашоў, Ларчанка і іншыя паспяхова рыхтуюць аспірантаў з замежных краін. Часта перад студэнтамі выступаюць дактары навук тт. Косарава, Абецэдарскі, Заўрыеў. Рэктар А. Н. Сеўчанка, прарэктары А. Я. Малышаў, С. А. Умрэйка асабіста ўдзяляюць многа ўвагі і падрыхтоўчаму факультэту і тым замежным студэнтам, якія займаюцца на іншых факультэтах. Карысную работу ў гэтым напрамку, як адзначае прамоўца, вядуць кафедры грамадскіх навук пад кіраўніцтвам Т. І. Прытыцкай, У. М. Сікорскага, В. І. Сцяпанава, І. М. Лушчыцкага, М. Р. Круцько, С. Я. Янчанкі.

К. К. Герман заклікае калектыў яшчэ лепш выконваць свой інтэрнацыянальны абавязак.

Аб становішчы ў падрыхтоўцы навуковых кадраў і перспектывах гаварыў прарэктар па навуковай рабоце прафесар **Л. В. Валадзько.** За апошнія гады працэнт выкладчыкаў з вучонымі ступенямі ва універсітэце ўзрос з 35 да 44. Гэта вялікі поспех, але ён ні ў якім разе не можа нас задаволіць. Скажам, за пяць год калектыў студэнтаў падвоіўся, але за гэтым ростам не паспявае наша аспірантура. Рэктарат прымае меры ў гэтым напрамку і цяпер вельмі многа сіл аддае арганізацыі навукова-даследчай работы. Новаму саставу парткома таксама трэба ўдзяляць паўсядзённую ўвагу выкананню планаў навуковых даследаванняў, падрыхтоўцы выкладчыкаў вышэйшай кваліфікацыі.

Многа цікавага паведаміў партыйнаму сходу рэктар універсітэта акадэмік **А. Н. Сеўчанка.** Універсітэт распачаў будаўніцтва навуковага гарадка, ёсць добрыя перспектывы ў забеспячэнні запатрабаванняў выкладчыкаў у жыллі, забеспячэнні студэнтаў інтэрнатамі. Вялікія задачы стаяць і ў галіне навуковых даследаванняў. Рэктар выказвае ўпэўненасць, што ўсе яны будуць вырашаны паспяхова.

З вялікімі прамовамі на партыйным сходзе выступілі міністр вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі БССР **М. М. Мяшкоў** і сакратар Ленінскага райкома партыі **Р. С. Піонава.**

З заключным словам выступіла Т. Я. Дударава. Яна падвяла вынікі спрэчак па дакладу, адзначыла асабліва дзелавы, арганізаваны характар сходу, адказала на пытанні.

Тайным галасаваннем быў выбран састаў парткома. Колькасна ён большы ў параўнанні з мінулагоднім. Адбылося першае пасяджэнне парткома. Сакратаром выбрана кандыдат гістарычных навук, дацэнт Таццяна Яфімаўна Дударава.



# СПРАВЫ ВЯЧЭРНІКАЎ

**Днямі адбыўся агульны сход вячэрнікаў гістарычнага факультэта і іх выкладчыкаў. Намеснік дэкана А. П. Ігнаценка ў дакладзе падвёў вынікі работы аддзялення, узняў шэраг пытанняў далейшага развіцця гэтай формы навучання.**

**У 1959—1960 навучальным годзе на гістфаку было ўсяго 25 вячэрнікаў, зараз іх налічваецца 464 (71 студэнт на аддзяленні філасофіі і 393—на гістарычным). Справы вячэрнікаў рэгулярна абмяркоўваюцца на вучоным савеце, пасяджэннях кафедр, партыйным і прафсаюзным бюро.**

**Далей Аляксандр Пятровіч адзначыў, што з вячэрнікамі займаюцца сем прафесараў — Л. С. Абецэдарскі, У. М. Сікорскі, Г. М. Ліўшыц, Р. М. Трухноў, Л. М. Шнеерсон, С. П. П'янкоў, Р. А. Левін, 16 дацэнтаў, 5 старшых выкладчыкаў, 6 выкладчыкаў. На кожным курсе маецца група студэнтаў, якія вучацца толькі на добра і выдатна. Сярод іх — Ананіч, Дзітлава, Бірылаў, Альшэўскі, Мазурава і іншыя.**

**Аднак у цэлым стан паспяховасці вячэрнікаў у мінулым навучальным годзе некалькі пагоршыўся ў параўнанні з пазамінулым. Слабей вучацца вячэрнікі і за студэнтаў дзённага аддзялення. Высокі працэнт выключаных за непаспяховасць і ненаведванне заняткаў. Так, у мінулым навучальным годзе былі выключаны 24 студэнты. Некаторыя маюць запазычанасці. Намеснік дэкана ўскрывае прычыны нізкай паспяховасці і адсеву студэнтаў. Гэта перш за ўсё вельмі вялікая занятасць студэнтаў-вячэрнікаў, якія і працуюць і вучацца, выконваюць грамадскія даручэнні. А адміністрацыя ж прадпрыемстваў і ўстаноў, дзе працуюць студэнты-вячэрнікі, часта не ўлічвае гэтага. Але нельга тлумачыць недахопы толькі аб'ектыўнымі прычынамі, ёсць і суб'ектыўныя. Пэўная катэгорыя студэнтаў прапускае заняткі без уважлівых прычын, не вывучае старанна асноўную і дадатковую літаратуру. Адсюль і пасіўнасць на семінарах, дрэнныя веды на заліках і экзаменах. Сярод такіх студэнтаў Слабко, Рудакоўская, Чэчына з першага курса, Андрыенка, Ганчарова, Гуцал з другога, Лінова, Коўган, Асташонак з чацвёртага, Баркоўская, Іскрык, Мізярнюк, Чыпайтэ з пятага курса, Бурскі, Тутук, Шыбалка, Давідовіч з шостага.**

**Аляксандр Пятровіч падкрэслівае, што за два з паловай месяца бягучага года вячэрнікі-гісторыкі прапусцілі 3.098 гадзін і з іх па няўважлівых прычынах — 1.578 (разам з аддзяленнем філасофіі).**

**Намеснік дэкана напомніў, што напярэдадні сесіі трэба паспяхова здаць залікі, затым звярнуў увагу студэнтаў на знешнюю культуру факультэта — чысціню і парадак у памяшканнях, беражлівыя адносіны да падручнікаў. У спрэчках выступіла шмат студэнтаў, якія ўздымалі пытанні аб напісанні дыпломных прац, здачы дзяржаўных экзаменаў, рабоце буфета і гардэроба, кабінетаў.**

**Цікавым было выступленне прафесара Г. М. Ліўшыца. Ён адзначыў, што вельмі рэдкая з'ява—гэта сход студэнтаў-вячэрнікаў. Не шкодзіла б такія сходы збіраць часцей, хаця б штогод. Гілер Маркавіч гаварыў аб прадастаўленні вячэрнікам тых жа правоў, што і стацыянарнікам — заахвочванні, занясенне на дошкі гонару, публікацыі іх прац у друку.**

**Старшыня камітэта народнага кантролю Леў Антонавіч Міхайлоўскі паведаміў аб выніках трох рэйдаў на вячэрнім аддзяленні. Ён прапанаваў звярнуць увагу на забеспячэнне студэнтаў падручнікамі, дапаможнымі літаратурнымі матэрыяламі, больш строга адносіцца да парушальнікаў дысцыпліны.**

**Выступілі і іншыя выкладчыкі. Староста другой групы пятага курса Ганна Селязнёва крытыкавала прагульшчыкаў, на бачных прыкладах паказвала, як важна студэнту-вячэрніку акуратна наведваць заняткі і дбаць аб паспяховасці, заверыла сход у гатоўнасці студэнцкага актыву зрабіць усё для забеспячэння дысцыпліны і паспяховасці ва ўсіх групах.**

**Сход прайшоў вельмі цікава, пры актыўным удзеле як прафесарска-выкладчыцкага саставу, так і студэнтаў. І хацелася б, каб падобныя сустрэчы праводзіліся часцей.**

**М. ВЯРШЫНІН,**
**А. ВЫСОЦКІ,**
**студэнты пятага курса вячэрняга аддзялення гістфака.**

# УНІВЕРСІТЭТ У ГЭТЫЯ ДНІ

*Поўным ходам ідзе падрыхтоўка да юбілейных урачыстасцей.*

*Толькі што адбылася агульнауніверсітэцкая навуковая канферэнцыя, прысвечаная 50-годдзю БССР і Кампартыі Беларусі, на якой падведзены вынікі навуковай работы на факультэтах. Яны гавораць аб шырыні пастаноўкі праблем нашымі вучонымі, аб плённых пошуках маладых даследчыкаў*

*А гэтыя пошукі нараджаюцца ў студэнцкай аўдыторыі, у час напружанай працы ў лабараторыі, каля складаных прыбораў або ў гарачай дыскусіі з таварышамі, калі рыхтуешся да экзамена.*

*На здымках І. АСКІРКІ і У. КАЛІНІНА адлюстраваны будні універсітэцкага жыцця.*

*Злева ўверсе — аспірант кафедры нафтахіміі Г. Роганаў праводзіць эксперымент. Унізе—выпускнікі факультэта журналістыкі рыхтуюцца да чарговага заліку. На здымку справа вы бачыце ўдзельнікаў секцыі матэматычных навук юбілейнай сесіі.*







АПОШНІ АЎТОБУС. Фота А. Ласмінскага.

# ЛІСТ ДА СЯБРА

Поціск тваёй рукі да гэтай пары я адчуваю ў сваёй далоні. А ў вушах стаіць твой спакойны, разважліва ціхі голас. А яшчэ часцей бачу я цябе ўдумліва ідучага паўз маладыя, невысокія клёны на нашай Паркавай. Быццам услухваўся ты ў іх шэпт, трапяткі і няясны. Я ніколі не бачыў, каб ты спяшаўся. Павольныя крокі, нетаропкія думкі... І неяк не вельмі ўсё гэта вязалася з тваімі гадамі—няпоўнымі двума дзесяткамі.

Выпадкова цябе я магу цяпер сустрэць, бо калі ты ад'язджаў настаўнічаць у сваю вёску, скончыўшы універсітэт, мы ні аб чым не дамаўляліся. Паціснулі адзін другому рукі, хлопнулі па плячы і, адважна адганяючы сум, пажадалі поспехаў у жыцці. Скрыпнулі колы, лязгнулі буферы, і ніхто, акрамя нас з табою, не падазраваў, што ты паехаў у сваё новае, загадкава-таямнічае заўтра.

Мы з табою не былі сябрамі. Запаветныя думкі свае мы дзялілі з іншымі людзьмі. (І як гэта звычайна здараецца, тыя іншыя нярэдка прыгожа не разумелі іх!)

А мо якраз тое, аб чым мы гаварылі, і было самым запаветным і дарагім для кожнага з нас. Бо чаму ж тады мы так усхвалявана радаваліся кожнай нашай новай сустрэчы і так шчыра і аддана гаварылі аб самым галоўным для нас—літаратуры.

Не ведаю, чаму так атрымалася, а толькі першы, каму ты паказаў свае пробы пяра—апавяданне «Дзічка», — быў я. Сарамлівасць тваю, што праглядвала скрозь сціплыя радкі аб першым юнацкім каханні, я стараўся не заўважаць. Далёка не прафесіянальнымі былі мае заўвагі, але ж нешта, напэўна, я змог табе падказаць, на нешта нацэліць тваю думку. А больш за ўсё, я ў гэтым упэўнен, не схаваў свайго захаплення ад тваёй сапраўды цудоўнай спробы.

Ну вось, дружа, я і прызнаўся табе ў тым, што саромеўся ці абыходзіў сказаць у тыя часы, калі нам выпадала быць разам. Ды і гэты мой крок—хутчэй вынік узмоцненага хвалявання, выкліканага тваім першым надрукаваным апавяданнем у часопісе «Маладосць».

Ты застаўся верным сабе: пішаш пра тое, што больш турбуе, непакоіць, аб чым ты сам хочаш трывала даведацца.

Ты пішаш аб каханні, маладым, гарачым і не зусім вызначаным. Баюся рабіць якія-небудзь заўвагі, каб не парушыць тое чыстае і неастуджанае пачуццё, з якім ты пісаў свой «Ліст да Олі».

Калі ж выпадак звядзе нашы сцежкі і мы будзем ісці з табою поплеч і нетаропка гаварыць аб самым запаветным — літаратуры, тады я абавязкова скажу табе і аб тых агрэхах, якіх не ўдалося табе пазбегнуць у сваім творы: празмернай лютасці Рамана, залішняй самотнасці Янака, некалькі ўмоўнай дасціпнасці ва ўсіх справах сямейных хлапчука дашкольнага ўзросту Генкі, ад імя якога вядзецца апавяданне. Але больш я скажу аб тых трапных і вельмі частых месцах, дзе бачна рука майстра, які добра адчувае слова і думку; рука, цяпло якой да гэтай пары я адчуваю ў сваёй далоні.

Вялікіх табе ўдач, Генрых Далідовіч! З сяброўскім пачуццём да цябе!

В. ПОЛЯК.

*У СТУДЭНЦКІХ ГУРТКАХ*

# РАМАНТЫКА ПОШУКАЎ

Першыя крокі даследчыка... Рэдка — гэта радасць новых адкрыццяў, часцей — горыч няўдач. Але заўсёды ў гэтых напружаных буднях ёсць прыемнае.

Над якімі праблемамі працуюць студэнты, тыя, хто толькі спрабуе пранікнуць у сакрэты навуковых даследаванняў?

На пытанні адказваюць члены гуртка навуковага атэізму.

Слова **Станіславу Гардзіевічу:**

Прызнаюся, я зайшоў на пасяджэнне гуртка выпадкова. Потым быў яшчэ некалькі разоў. Доўга выбіраў тэму. Увогуле, як выбіраў? Усё для мяне было невядомым. Хацеў нават збегчы, каб не такі выпадак. Слухалі Алега Кузняцова. Ён — лектар, мы—радавыя «веруючыя». Спрэчка, якая разгарнулася паміж «атэістам» і «веруючымі» вызначыла мой выбар. Застаюся — такім было рашэнне. Зараз працую над тэмай «Праблемы вайны і міру ў сучасным хрысціянстве». Работа забірае вельмі многа часу, але ж яна і дысцыплінуе.

Я захапляюся лыжным спортам. Дарэчы, трэніровкі ў мяне пяць разоў у тыдзень. Знаходзіцца час і для драматычнага тэатра, мастацкай літаратуры, музыкі, асабліва люблю вакальныя творы старажытных майстроў.

**Алег Кузняцоў:**

З вялікім задавальненнем працую над тэмай «Ідэалогія і палітыка сучаснага каталіцызма». Даводзіцца многа чытаць па пытаннях ідэалогіі і палітыкі сучаснага каталіцызма ў краінах сацыялізма, пра сутнасць багаслоўных канцэпцый аб вайне і міру.

Маё самае запаветнае жаданне — напісаць дыпломную работу, якая мела б свой твар.

**Мікалай Бондар:**

Два гады я збіраю матэрыялы аб Луначарскім. Чалавек шырокай эрудыцыі, вялікай унутранай культуры, буйны грамадскі і палітычны дзеяч, ён у дарэвалюцыйны перыяд дапускаў памылкі ў вырашэнні шэрагу пытанняў па праблемах рэлігіі. Мая задача — прааналізаваць погляды Луначарскага на рэлігію і яго атэістычную дзейнасць у савецкі перыяд. Хутчэй бы акунуцца ў архіўныя матэрыялы! І яшчэ адно. Калі слухаеш змястоўныя даклады рабят на пасяджэннях гуртка, шкадуеш, што нас мала... Я заклікаю першакурснікаў: запісвайцеся ў наш гурток. Захапляючая работа чакае вас, не пашкадуеце!

Цікавы калектыў, вялікія ў яго планы. Значная заслуга ў гэтым навуковага кіраўніка гуртка Віктара Аляксандравіча Молакава, кандыдата філасофскіх навук. Застаецца толькі пажадаць маладым даследчыкам вялікіх поспехаў.

**П. БОНДАР,**
**студэнт IV курса гістфака.**

# МАЁ ДРЭЎЦА



Неяк ні кроплі не верыцца, што я ўжо вучуся на факультэце журналістыкі. Здаецца, вось учора сядзела ў садку каля хаты на мяккай шаўкавістай траве і многа раз перачытвала творы беларускіх пісьменнікаў і паэтаў: рыхтавалася да прыёмных экзаменаў ва універсітэт. А сёння я ўжо хаджу па вуліцах Мінска, з цікавасцю назіраю за ўсім гарадскім, многа чым да гэтага незнаёмым. Я прыслухоўваюся да звону трамваяў, шоргату тралейбусаў, вечарамі задзіраю галаву і любуюся агнямі ліхтароў, крочу па вуліцах сярод натоўпу мінчан, якія ўсё некуды спяшаюцца.

Першы год жыцця ў вялікім горадзе. Нязвыкла яшчэ, цягне ў вёску. Ды я думаю, хай прабачыць мяне горад, што вёска застанецца ў маім жыцці самым блізкім астраўком у вялізным акіяне, самым светлым малюнкам у маім незабыўным дзяцінстве. Так, у вёсцы я правяла басаногае дзяцінства.

У садзе, дзе я вучыла вершы паэтаў, расце маё дрэўца — высокая, стройная бярозка. Яна пачынае лічыць гады майго юнацтва. Я пасадзіла яе ў гэтым годзе.

У канцы верасня я пайшла ў свой любімы лес. Восень — гэта залатая пара года, хоць і сумнаватая. Дрэвы пераапраналіся ў асенняе адзенне, апраналі рознакаляровыя сукенкі. У лесе станавілася маркотна, прыціхлі птушыныя спевы. Пад дубам валяліся здаровыя, спелыя жалуды, запахла прэлым лісцем, задрыжэлі асіны, па ўсім лесе разнёсся пах смалістага настою ад медна-шэрых сосдаў.

З-за кудзелістых хмар выглянула асенняе сонца, коса сыпнула няяркія промні на галіны дрэў, пабляклы верас, пацямнелыя ад часу рудыя пні, каржакаватыя яліны сосдаў, прасвечвала заросшыя павуціннем і плесенню шаты іх.

Паднялася з зямлі пара, павіс нейкі малочны туман; ногі стаміліся, цела ныла ад доўгай хады па гушчары. Узышла на залубелы, лішаісты ўзгорак з купінамі крывых бяроз і села на стары пень. Успомнілася многае.

...Школа, апошні выпускны баль, радасць за залаты медаль, хваляванне на ўступных экзаменах, жыццё ў вёсцы і горадзе — вось думкі, якія апанавалі галаву, блыталіся адна з другой.

Захацелася падараваць свайму радаснаму дзяцінству штосьці векапомнае, трапяткое, каб яно было звязана з дзяцінствам, любімейшым яго месцам. Я знайшла самы дарагі вобраз дзяцінства — бярозку, якая расла сярод калючых соснаў. Што дзіўна, рост яе супаў з маім. Вось здарова, будзем разам расці, набірацца жыватворных сокаў зямлі. Вось цікава, хто хутчэй вырасце?! Гэта пакуль што тайна.

Я выкапала дрэўца ў лесе і пасадзіла яго каля плоту ў садку. Якая прыгожая мая бярозка! Галінкі — кучаравыя, ствол—карычневы. Некалі ў яе будзе белая кара. Во будзе прыгажосць! Я нікому не скажу, што расце ў нас у садку талісман, мой верны сябра. Пяць год я буду ў горадзе, але ў вёсцы заўсёды будзе мяне чакаць мой дом, мама і бярозка. Яна будзе расці разам са мной, набірацца сіл, кожную вясну ярка зелянець ліпкімі лісточкамі, вітаць мой радасны настрой, а восенню ападаць рознакалярозымі лістамі да долу, неспакойна адлічваць мае юнацкія гады.

Ідуць дні. Аддала восень ключы зіме, а сама сышла ў небыццё да апошняга года. Белай пуховай касынкай ахутана мая бярозка. Дрэвы засынаюць. Але прыйдзе вясна, ружовыя промні сонца кінуць пунсовыя цені на прыдарожныя кусты. Прасне́цца мая бярозка, раскрые ліпкія лісткі, весела ўсміхнецца сонцу, вясне і мне. Яна чакае майго прыезду. На колькі падрасцем мы за год, як набярэмся сіл, як разрастуцца ў жыцці нашы маладыя карэнні — вось што хвалюе мяне.

**А. АНТАНОВІЧ,**
**студэнтка першага курса.**



Беларускі нацыянальны танец «Лявоніха» заваяваў папулярнасць і сярод в'етнамскіх юнакоў і дзяўчат. Наш фотакарэспандэнт М. Нічыпарэнка зрабіў гэты здымак у час інтэрнацыянальнага вечара дружбы.

# САМАЯ—САМАЯ...

*САМАЙ старэйшай з выходзячых цяпер газет з'яўляецца італьянская «Гадзетта дзі Мантова» (г. Мантуя). Нядаўна ёй споўнілася 304 гады. Яна належыць кааператыву журналістаў, служачых і рабочых.*

*САМЫМ раннім творам вялікага італьянскага мысліцеля і атэіста Джардана Бруно была кніга «Дэмагорген» (1572 г.). Устанавіць гэта нядаўна ўдалося польскаму вучонаму Анджэю Навіцкаму, які знайшоў сам твор ва Вроцлаўскай бібліятэцы. Кнігі Бруно, як вядома, пасля спалення яго на кастры былі знішчаны. Вроцлаўская бібліятэка—адзінае ў свеце кнігасховішча, дзе ўцалеў арыгінальны твор вялікага вучонага.*

*САМЫЯ даўгавечныя лісці ў вельвічыі цудоўнай. Яны жывуць разам з раслінай амаль да ста год.*

Адказны рэдактар М. І. ІОСЬКА.

АТ 20470. Адрас рэдакцыі: г. Мінск, Універсітэцкі гарадок, галоўны корпус, п. 106. Тэлефон: 22-07-19. Тыраж 2000 экз. Зак. 2166.